**Панамарова П.А.,** студ. гр. 302 БДУКМ
Навук. кір. – Гулак А.А.,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

# АДЛЮСТРАВАННЕ АРХАІЧНЫХ ВЕРАВАННЯЎ У ДЗІЦЯЧЫМ ФАЛЬКЛОРЫ

Дзіцячы фальклор з'яўляецца ўнікальным культурным інструментам далучэння новых пакаленняў да багацця нацыянальная культуры. Гэта скарбніца самых яркіх твораў дзіцячай народнай творчасці і ў той жа час універсальная педагагічная сістэма перадачы сацыякультурнага вопыту.

Многія даследчыкі адзначаюць, што дзіцячае ўспрыманне свету вельмі падобна да сінкрэтычнага мыслення чалавека на ранніх ступенях свайго развіцця. Як сцвяржае А. І. Гурскі, «стабільнасць дзіцячага светаўспрымання паспрыяла захаванню рэшткаў старажытных вераванняў, якія ў фальклоры дарослых не захаваліся, таму што перасталі адпавядаць новаму ўспрыманню свету» [1, с. 374]. Таму матэрыялы, атрыманыя пры аналізе твораў дзіцячага фальклору, могуць паслужыць асновай для рэканструкцыі элементаў архаічных вераванняў, а таксама для разумення генезісу фальклору наогул.

Для твораў дзіцячага фальклора характэрна прастата моўных канструкцый, нескладаны, але дынамічны сюжэт, яркія вобразы, і кананічнасць. Часта ў розных творах паўтараюцца адны і тыя ж сюжэтныя матывы. Гэта тлумачыцца асаблівасцямі вуснай перадачы фальклорных тэкстаў, якія разлічаны на вобразнае ўспрыманне, хуткае запамінанне і трывалае засваенне. Менавіта прастата і яснасць твораў дзіцячага фальклору і паспрыяла захаванню таго зыходнаха сэнсу, які ўкладвалі ў тэкст нашы далёкія продкі.

Працэс пранікнення элементаў культуры дарослых у дзіцячы фальклор даследавалі А.І. Гурскі, Г.А. Барташэвіч, К.П. Кабашнікаў у працы «Малыя жанры. Дзіцячы фальклор». Самая галоўная канцэптуальная выснова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заключаецца ў тым, што гэты працэс адбываецца шляхам пераадрасацыі твораў дарослых дзіцячай аўдыторыі, шляхам міжвольнага пераймання дзяцьмі твораў дарослых са спецыфічна дзіцячай трансфармацыяй тэксту, а таксама шляхам адвольнага пераймання, найважнейшай формай якога з'яўляецца парадыраванне дзецьмі твораў дарослых [1, с. 316]. Менавіта разнастайнасць шляхоў засваення культурнай спадчыны прыводзіць да стракатасці і неаднастайнасці сюжэтна-тэматычнай асновы твораў дзіцячага фальклору. Яны, паводле М. Ю. Навіцкай, «вынік складанага, шматступеннага працэсу асіміляцыі народнай культуры, які сыходзіць сваімі каранямі ў яе найстаражытныя пласты, захоўваючы ў дзіцячым рэпертуары элементы абрадавага і іншых відаў дарослага фальклору» [3, с. 1].

Яскравым прыкладам адлюстравання элементаў архаічных вераванняў у дзіцячым фальклоры з'яўляюцца заклічкі і прыгаворкі. У зваротах да сонца і дажджу захаваліся рэшткі старажытных язычніцкіх заклінанняў. Сюжэтна-тэматычнай асновай заклічак з'яўляецца зварот да якой-небудзь прыроднай сілы з абяцаннем узнагароды або ахвярапрынашэння. У наступным прыкладзе відаць імператыў да спынення дажджу. У якасці сімвалічнай узнагароды выступае пачастунак (боршчык): *Не йдзі, не йдзі, дожджыку, // Звару табе боршчыку. // Пастаўлю пад лаўкаю, //Накрыю лапаткаю. // Пастаўлю пад елкаю, // Накрыю талеркаю. // Талерачка здымецца, // А дожджык унімецца* [7].

Абяцанне дароў, матывы кармлення маюць глыбокія язычніцкія карані і ўзыходзяць да старажытных рытуалаў ахвярапрынашэння з мэтаю забяспячэння спрыяльных умоў для земляробства. Даследчыкі мяркуюць, что некалі дажджу сапраўды гатавалі частаванне. Выканаўцамі рытуалаў часцей за ўсё былі менавіта дзеці, якія вылучаліся па прыкмеце рытуальнай «чысціні».

Даволі распаўсюджаны на Беларусі заклічкі, якія звязаны з народнымі прыкметамі, што таксама ўказвае на іх сувязь з язычніцкім светаўспрыманнем нашых продкаў: *Бусел, бусел калода, // Што заўтра будзе*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– // *Дождж ці пагода? // Калі сонейка – кружыся, // Калі дожджык, то садзіся* [7]. Пазней заклічкі адчулі на сабе ўплыў хрысціянскай культуры, аб гэтым сведчыць наступны прыклад: *Дожджык, дожджык,секані. // Я паеду на кані. // Богу маліцца, // Хрысту хрысціцца* [5]. З цягам часу песні-заклічкі страцілі свой першапачатковы сэнс і цалкам перайшлі з рэпертуару дарослых у дзіцячае асяродзе.

Яшчэ адным жанрам дзіцячага фальклору, які свімі вытокамі вырас з рытуальна-бытавой практыкі дарослых, з'яўляюцца лічылкі. Аб сувязі лічылак са старажытнымі вераваннямі сведчаць мясцовыя назвы беларускіх лічылак – «варажба», «варажбіткі» [1, с. 422]. Лічылкі ўзніклі ў нетрах першабытнага ладу, калі іх прызначэнне было звязана з паспяховым выкананнем агульнай справы або пры вырашенні сацыяльна-палітычных пытанняў. Ва ўяуленні нашых продкаў рашэнні, вынесеныя з дапамогай жэраба (а значыць, па волі вышэйшых сіл) з'ўляліся справядлівымі і непарушнымі.

У старажытнасці існавала забарона на прамой пералік рэчаў, таму была вынайдзенай форма ўскоснага пераліку, у якім падліковыя адзінкі замяняліся іх слоўнымі эквівалентамі. Гэтым абумоўлена мудрагельства некаторых выразаў. Яркім прыкладам гэтаму можа паслужыць наступная лічылка, у якой кожнае слова з'яўляецца змененай формай пэўнай лічбы: *Анцы-цванцы,// Трынцы-ярынцы,// Пятым-ладым,// Шуктым-буктым, // Дэвір-дэкс!* [7].

Сучасныя лічылкі нярэдка змяшчаюць элементы старажытнай культуры. У некаторых узорах галоўнымі дзеючымі асобамі з'яўляюцца міфалагічныя персанажы, напрыклад, чэрці: *Чэрці ў возеры купаліcь, // Чэрці рожкамі штурхаліcь, // Чорт чарцёнка штурхануў // І чарцёнак патануў* [7].

Аб сувязі зместу лічылак з архаічнымі ўяўленнямі сведчыць яшчэ тое, што ў некаторых творах захавалася і так званае «чуранне». Этымалогія слова «*чур*» дакладна невядома, але часцей за ўсё яго звязваюць са старажытнай міфалагічнай істотай, якой прыпісваюць рысы дамавіка, продка, апякуна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роду. Вядомы вокліч «*Чур я*! » /«*Чур мяне*! », магчыма, сваім паходжаннем звязаны з акрэсленнем магічным колам, якое тлумачыць дзеясловы кшталту «цурацца», «адцурацца» — выдаліць за межы роду, за родавую рысу [4, с. 559].

Адбіткі старажытных язычніцкіх культаў захаваліся таксама і ў дзіцячых гульнях. Гульні часта былі абрадавымі і выконваліся ў пэўны вызначаны час, былі часткай цэлага комплексу святкавання. Умоўныя спаборніцтвы паміж удзельнікамі ці камандамі былі насычаныя фальклорнымі вобразамі і хавалі ў сабе магічны сэнс. За дзеяннямі звяроў і міфалагічных персанажаў можна прасачыць адвечную барацьбу паміж сіламі святла і цемры.

Выразным прыкладам забавы, якая ў мінулым мела рытуальна-абрадавае прызначэнне, з’яўляееца дзіцячая гульня «Каршун». Існуе нямала варыянтаў гэтай папулярнай ва ўсіх рэгіёнах Беларусі гульні, хаця аснова ў іх адна [2, с. 8].

Галоўнымі дзеючымі асобамі ў гэтай гульні з’яўляецца «матка» і «каршун». Да вобраза каршуна на Беларусі не было адназначнага стаўлення. У першую чаргу каршун успрымаўся як шкоднік, які часта нападае на свойскіх птушак. На Палессі існаваў абрад выгнання каршуна, які павінны быў магічным шляхам ахаваць курэй ад яго нападаў. Удзельнікамі абраду былі жанчыны,  а мужчыны з’яўляліся толькі на апошнім этапе з забітым каршуном, за што атрымлівалі ад жанчын пачастунак [4, с. 231 – 232].

У іншых раёнах Беларусі да каршуна наадварод ставіліся з пэўнай асцярожнасцcю, баяліся яго раззлаваць. Выкарыстоўвалася слоўная магія: раніцай гаспадары выходзілі на агарод і звязвалі пару калоў вяроўкай і гаварылі: «Як у агарода калы звязаныя, так звязаныя ногі ў каршуна, каб не краў курэй» [8]. На Смаленшчыне дзеці, заўважыўшы каршуна, пачыналі махаць на яго хусткай і крычаць: «Каршун ляціць, трасцу схваціць… Шу-у-гу!» [4, с. 232].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нашы продкі лічылі, што з дапамогай пэўных рытуальных дзеянняў і абрадаў, загадзя мадэлююцца сітуацыі і ролі, напрыклад паляўнічых і здабычы, або драпежніка і хатніх жывёл. Такім чынам праграмуюцца падзеі будучыні. Гульня «Каршун» нясе ў сабе адбіткі рытуалу, накіраванага на абарону хатніх птушак ад нападу драпежніка.

На сувязь гульні з архаічнай культурай указвает таксама традыцыя назваць адну з галоўных дзеючых асоб гульні «маткаю». Можна меркаваць, што гэта з'яўляецца водгаласам глыбокай старадаўнасці – перыяду матрыярхату [1, с. 430].

Дзіцячы фальклор і ў мінулым, і сёння выконвае выхаваўчую і эстэтычную функцыі, але акрамя гэтага ён з'яўляецца унікальным захавальнікам гістарычых ведаў, які ўтрымлівае інфармацыю пра побыт нашых продкаў і асаблівасці іх светаўспрымання. Многія тэксты дзіцячага фальклору змяшчаюць выразы, якія для дзяцей з'яўляюцца бессэнсоўнымі, але маюць пэўную каштоўнасць для даследчыкаў, таму што ў іх зашыфраваныя рэшткі старажытных язычніцкіх заклінанняў. У асобных творах дзіцячага фальклору выразна прасочваюцца такія элементы архаічных вераваняў і практык, як татэмістычныя ўяўленні, аказіянальныя абрады, абрады ініцыялізацыі, метэаралагічная варажба і ахвярапрынашэнні. Як мы бачым, творы дзіцячага фальклору ў сваіх вытоках маюць архаічныя вераванні, але накіраванасцю звернутыя да будучыні.

---

1. Гурскі, А.І. Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / А.І. Гурскі, Г.А. Барташэвіч, К.П. Кабашнікаў; навук. рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 439 с.

2. Лозка А.Ю. Народныя гульні : вучэб. дапам. (вытрымкі з кнігі) / А.Ю. Лозка – Мінск, 2002 – 48 с.

3. Новицкая, М.Ю. Русский детский внеигровой фольклор (стихотворные жанры) : автореф. дис. … канд. филол. наук. / М.Ю. Новицкая. – Л., 1985 – 247 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Санько, С. Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мінск : Беларусь, 2004. – 592 с.

5. Інтэрнэт-партал газеты “Наша Ніва” / Каб ваш ложак добра скрыпаў… [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://nn.by/?c=ar&i=21165. – Дата доступу : 20.03.2014.

6. Інтэрнэт-партал культурна-асветніцкага клуба “Спадчына” / Курынае свята [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://spadchyna.net/index.php?view=details&id=2981%3A%D0%A1%D0%86%D0%9B%D0%AC%D0%92%D0%95%D0%A1%D0%A2%D0%A0&option=com_eventlist&Itemid=9. – Дата доступу : 20.03.2014.

7. Інтэрнэт-партал “Нашыя дзеткі” / Народныя лічылкі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://dzietki.org/article/cms_view_article.php?aid=107. – Дата доступу : 20.03.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ